ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986

8 СТУДЗЕНЯ

ЧАЦВЕР

№ 1 (1522)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

«ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ

змяненняў у Статуце ВЛКСМ — гэта галоўны настрой усіх камсамольцаў. На пасяджэнні бюро камітэта камсамола БДУ прынята рашэнне аб правядзенні абмеркавання праекта змяненняў на сходах ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях універсітэта.

Камітэт камсамола запрашае ўсіх камсамольцаў прыняць зацікаўлены ўдзел у гэтай важнай кампаніі, унесці свае канструктыўныя прапановы па павышэнню аўтарытэту, ініцыятывы і самадзейнасці камсамола, далейшаму яго арганізацыйна-палітычнаму ўмацаванню, уздыму актыўнасці і павышэнню адказнасці членаў Саюза моладзі ў барацьбе за выкананне рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Усе выказаныя заўвагі і прапановы будуць аператыўна разглядацца, абагульняцца, друкавацца ў газеце «Беларускі універсітэт», накіроўвацца ў адрас вышэйстаячых камсамольскіх органаў і XX з'езда ВЛКСМ.

Чакаем вашых прапаноў!

А. ЖУК,
сакратар камітэта камсамола універсітэта.

### МЫ — ЗА МІР!

— пад гэтым дэвізам прайшоў урок паэзіі на падрыхтоўчым факультэце для замежных грамадзян БДУ імя У. І. Леніна. Болей двухсот студэнтаў з 42 краін свету актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і правядзенні гэтага незвычайнага ўрока, пачаткам якога быў мітынг на плошчы Перамогі каля Вечнага агню.

Другая частка ўрока, якая складалася з літаратурна-мастацкай кампазіцыі, прайшла ў актавай зале універсітэта.

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы ўрока адыгралі выкладчыкі рускай мовы. Студэнты чыталі вершы і прозу на блізкай, стаўшай для іх роднай мове міру і дружбы. Многія прадэманстравалі добрыя веды.

С. СНАПКОЎСКАЯ,
выкладчыца.

### БАЗАВАЙ ВНУ

з'яўляецца БДУ імя У. І. Леніна ў галіне кантролю па групе ВНУ культуры, адукацыі, эканомікі. Нядаўна адбылася нарада, у рабоце якой прынялі ўдзел прарэктар па завочнаму навучанню Гродзенскага універсітэта М. В. Васілючак, дэкан бібліятэчнага факультэта інстытута культуры Р. А. Ровіна, загадчык кафедры Гомельскага універсітэта В. А. Баркоў, прарэктар інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава А. З. Шыткоўскі, дацэнт інстытута замежных моў А. А. Няхай. Былі разгледжаны пытанні паляпшэння працы АМК ВНУ па кантролю за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў.

Ф. ЧУМАКОЎ,
дацэнт кафедры тэорыі функцый.

## ВІНШУЕМ!

### ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖПРЭМІЙ БССР

**Напярэдадні Новага года прынята пастанова аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Беларускай ССР 1986 года ў галіне навукі і тэхнікі. Сярод лаўрэатаў — група вучоных універсітэта:**

ЧАРНЯЎСКІ Аляксандр Фёдаравіч, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР, дырэктар навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі, кіраўнік работы, АШКІНАДЗЕ Данііл Аўрамавіч, ДАНІЛЕВІЧ Усевалад Васільевіч, ЯКУШАЎ Аляксандр Кузьміч, кандыдаты тэхнічных навук, загадчыкі лабараторый, ДЗЯМЧУК Міхаіл Іванавіч, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР, галоўны навуковы супрацоўнік, работнік таго ж інстытута,— за распрацоўку і ўкараненне ў практыку оптыка-фізічных даследаванняў статыстычных метадаў часовага аналізу хуткапераменных патокаў светлавога выпраменьвання.

ЯКУШКА Вольга Піліпаўна, доктар геаграфічных навук, прафесар,— за распрацоўку і ўкараненне навуковых асноў геалогіі антрапагена і геамарфалогіі ў практыку геолагаразведачных работ у рэспубліцы.

ГОЛЬЦАЎ Усевалад Паўлінавіч, доктар тэхнічных навук, загадчык кафедры,— за распрацоўку і стварэнне новых тэхналагічных працэсаў і абсталявання для нанясення тонкаплёначных пакрыццяў метадам іённа-прамянёвай апрацоўкі і іх шырокае ўкараненне ў народную гаспадарку рэспублікі.

ШАКУН Леў Міхайлавіч, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры,— за вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы», апублікаваны ў 1984 годзе.

*ГРУК, грук, грук... Дзверы вучэбных карпусоў і інтэрнатаў паслухмяна адчыніліся і прапусцілі сваю знаёмую. Студэнты і выкладчыкі, хто з радасцю, хто з жалем, сутыкнуліся з госцяй і ўступілі ёй дарогу. Сесія ўладарна запаланіла аўдыторыі, бібліятэкі, лабараторыі.*

*Галіна Прыгара — студэнтка першага курса факультэта журналістыкі.*

*Хоць і добра вучылася Галя на працягу семестра, актыўна адказвала на семінарскіх занятках, дапамагала аднакурснікам, але ж гэта сесія — першая ў яе студэнцкім жыцці. І зразумела хвіляванне дзяўчыны. Таму нам хочацца пажадаць Галіне, усім першакурснікам, наогул усім студэнтам і выкладчыкам паспяховай сустрэчы з сесіяй. Бо сесія — гэта не толькі балы, гэта перш за ўсё спасціжэнне — ісціны, новага, сябе...*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*




На справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі БДУ імя У. І. Леніна быў пастаўлены шэраг вострых, актуальных пытанняў, звязаных з жыццём моладзі. Хацелася б падзяліцца некаторымі меркаваннямі адносна шляхоў перабудовы нашага камсамольскага жыцця.

*што б я сказаў з трыбуны XX з'езда ВЛКСМ*

# ПЕРАБУДОВА — НЕ КАМПАНІЯ

НІ БУДУ ЎТОЙВАЦЬ, што жаданне выступіць публічна ўзнікла пасля тэлерэпартажу ЦТ аб камсамольскай канферэнцыі ЗІЛа і ў асаблівасці інтэрв'ю з кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС, першым сакратаром МГК КПСС Б. Ельцыным. Асабліва кранулі сэрца словы аб неабходнасці не касметычных, эвалюцыйных паляпшэнняў дзейнасці камсамола, а рэвалюцыйнага змянення стылю і метадаў работы. Тав. Ельцын яшчэ раз надаў увагу факту маруднай раскачкі камсамольскага апарату, неадпаведнасці правільных слоў аб перабудове рэальнаму ходу гэтага працэсу. Па думцы важакоў ЗІЛаўскай камсамоліі, перабудова ў арганізацыі ідзе поўным ходам, тады як трохгадзінная гутарка першага сакратара МГК у інтэрнатах з радавымі камсамольцамі высветліла, што якіх-небудзь значных змяненняў у жыцці моладзі няма.

Трэба смела і адкрыта прызнаць, што такім жа чынам ідуць справы і ў нас у БДУ.

Болей як месяц назад вышэйшы орган камсамольскай арганізацыі БДУ прыняў рашэнне аб увядзенні студэнцкага самакіравання, аднак апытанне студэнтаў ФПМ (групы 1, 4) паказала, што яны маюць вельмі цьмянае ўяўленне аб гэтай «з'яве». Відавочна, камітэты камсамола па-ранейшаму вязнуць у рашэнні дробязных, штодзённых пытанняў, аслабляючы ўвагу да вузлавых праблем жыцця універсітэта.

Добра зразумела, што нашы камсамольцы ўсхвалявана абмяркоўваюць вынікі вострых, неадназначных, але па-сапраўднаму смелых і наватарскіх камсамольскіх канферэнцый ВАЗа, ВЭФа, ЗІЛа, але чаму ў сценах нашай ВНУ, буйнейшай у рэспубліцы і адной з вядучых у краіне, не з'яўляюцца прынцыпова новыя і смелыя маладзёжныя ініцыятывы? Можа, гэтыя ініцыятывы і ўзнікаюць на ўзроўні пярвічных, але так і застаюцца незаўважанымі камітэтам камсамола, які ўсё яшчэ не хоча станавіцца генератарам каштоўных ідэй і пачынанняў?

Так, напрыклад, ёсць усе падставы падтрымаць прапановы камсамольцаў МДУ імя М. В. Ламаносава ў адрас XX з'езда ВЛКСМ аб аўтаматычным выбыванні з камсамола асоб, якія на працягу трох месяцаў не заплацілі ўзносы і не сталі на ўлік альбо не зняліся з уліку на працягу вызначанага Статутам тэрміну. Тады адпала б неабходнасць абмяркоўваць на пленумах камітэта камсамола БДУ пытанні пастаноўкі і зняцця з уліку нядбайных камсамольцаў, вызваліліся б у сакратароў камсамольскіх арганізацый час і энергія, такія неабходныя для рашэння кардынальных пытанняў, а арганізацыйны аддзел камітэта камсамола паспяваў бы своечасова афармляць пратаколы канферэнцый, пленумаў, бюро. Тады, безумоўна, бюро камітэта камсамола было б што расказаць і пра сваю працу ў нашай шматтыражцы радавым камсамольцам.

Між тым, бюро камітэта камсамола да гэтага часу не адрэагавала на крытычныя заўвагі ў свой адрас па пашырэнню галоснасці ў рабоце, якія былі выказаны на канферэнцыі. Вось і атрымліваецца, што сёння мы больш ведаем аб справах у Палітбюро ЦК КПСС, чым у камітэце камсамола БДУ.

Аднак, відавочна, гэтая хвароба не толькі нашага камітэта, але і рэспубліканскіх камсамольскіх органаў. У той час калі «Комсомольская правда» паведамляе нам пра таленавітага камсамольскага лідэра з Куйбышава, пра смелую, энергічную перабудову працы Адэскай і Ліепайскай камсамольскіх арганізацый, нашы рэспубліканскія газеты друкуюць парадкі дня пленумаў ЦК ЛКСМБ, на якіх па-ранейшаму разглядаюцца традыцыйныя пытанні.

Мабыць таму мы і даведваемся з «Комсомольской правды», а не з рэспубліканскага друку пра з'яўленне ў некаторых нашых арганізацыях так званых «лідэраў з боку». Зусім немагчыма знайсці ў нашых рэспубліканскіх выданнях што-небудзь змястоўнае пра мінулую справаздачна-выбарную кампанію горада-героя Мінска. Быццам бы і не было яе зусім. Такое становішча спраў нас ужо не задавальняе. Што на гэты конт мяркуе ЦК ЛКСМБ?

Не трэба забывацца, што ЦК ЛКСМБ павінен быць мазгавым цэнтрам беларускай камсамоліі, генератарам ідэй, а не дробязным апекуном, павінен паказваць прыклад смелых, нетрадыцыйных, перспектыўных, а не аджыўшых падыходаў і рашэнняў.

На сённяшні дзень яскрава адчуваецца вострая неабходнасць у павышэнні прэстыжу, ролі камсамола пры вырашэнні ўсіх праблем жыцця нашага грамадства. Возьмем наш універсітэт. Прадстаўнікі нашай арганізацыі ёсць у рэктараце, савеце універсітэта і факультэтаў, у розных метадычных камісіях і г. д. Аднак будзем гаварыць праўдзіва: рэальны ўплыў на важнейшыя сферы жыцця універсітэта мінімальны. Значыць, наш удзел у працы названых органаў ці фармальны, ці фармальныя нашы прадстаўнікі, нашы лідэры.

Нашай архімедавай кропкай апоры ў рэвалюцыйным працэсе перабудовы павінна рэальна стаць (падкрэсліваю — рэальна!) наступнае: удзел ці папярэдняе ўзгадненне камітэтаў камсамола павінны быць абавязковымі пры вырашэнні такіх пытанняў, як прыём і звальненне саюзнай моладзі да 30 гадоў, падвядзенне вынікаў сацспаборніцтва, узнагароджанне пуцёўкамі, прэміямі, прадастаўленне кватэр, выбранне па конкурсу, рэкамендацыя ў аспірантуру.

Цвёрда ўпэўнены, што калі мы не вырашым гэтыя пытанні, то нічога ў нашай працы не зменіцца і ні аб якой перабудове не можа быць і гутаркі.

Ю. ПАЗНЯК,
асістэнт мехмата.

ФПК

# «Поспехаў у працы!»

— ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! Дазвольце без гучных слоў.— Мікалай Мінавіч Дрозд, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пры БДУ імя У. І. Леніна, звярнуўся да ўрачыста сціхшай аўдыторыі.— Вось у мяне ў руках пасведчанні аб заканчэнні факультэта. Уручаючы іх вам, хацелася б адзначыць, што нашы выкладчыкі імкнуліся даць той максімум ведаў, які дазволіў бы вам найбольш эфектыўна працаваць з падрастаючым пакаленнем. Зараз, калі месяцы вучобы засталіся ўжо за плячыма, хочацца пажадаць вам такіх жа дапытлівых вучняў, якімі былі вы. Поспехаў вам у працы!





Так адкрыўся выпускны сход на факультэце павышэння кваліфікацыі. Пасля з кароткай прамовай да выпускнікоў звярнуўся прарэктар універсітэта А. В. Шарапа. Ён жа і уручыў ім пасведчанні аб заканчэнні факультэта павышэння кваліфікацыі, а таксама аб'явіў падзякі найбольш актыўным слухачам.

А. СЦЯПАНАЎ.



НА ЗДЫМКАХ: чарговы выпуск, але ён, як заўсёды, нейкі асаблівы, незвычайны. І дэкану факультэта павышэння кваліфікацыі Мікалаю Мінавічу Дразду хочацца пажадаць выпускнікам кожнаму на сваім месцы быць такім жа дапытлівым, цікаўным, як і ў час вучобы на факультэце; пасведчанне аб заканчэнні — гэта не проста дакумент, гэта таксама і фініш вучобы на факультэце. Уручае іх прарэктар універсітэта А. В. Шарапа; вось і ўсё. Апошнія словы удзячнасці, апошнія апладысменты. Пройдзе дзень-другі, і слухачы пачнуць дзяліцца атрыманымі на факультэце ведамі з навучэнцамі вучылішчаў і тэхнікумаў.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

## Газета выступіла. Што зроблена?

### Сувязь будзе!

САКРАТАР партбюро юрыдычнага факультэта дацэнт В. М. Гадуноў паведамляе, што артыкул «Толькі краем вуха», надрукаваны ў газеце «Беларускі універсітэт» 30 кастрычніка 1986 года, абмеркаваны на пасяджэнні прафсаюзнага бюро з запрашэннем актыву. Адзначана, што прафсаюзнаму бюро сапраўды не ўдалося дасягнуць трывалых кантактаў з прафгрупамі.

У мэтах умацавання сувязі з прафгрупамі арганізавана вучоба прафгрупоргаў І—ІІ курсаў і давядзенне да іх неабходнай інфармацыі. Для асвятлення работы студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі наладжаны выпуск насценгазеты «Аб'ектыў». У адпаведнасці з планам работы партыйнай арганізацыі ў красавіку 1987 года на партсходзе факультэта будзе абмеркавана пытанне аб рабоце прафсаюзнай арганізацыі па ўмацаванню ў студэнцкім асяроддзі здаровага і культурнага ладу жыцця.

### Зноў пра ГПП

КРЫТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ «Якая яшчэ ёсць адзнака?», надрукаваны ў газеце «Беларускі універсітэт» 23 кастрычніка 1986 года, абмяркоўваўся на пасяджэнні савета па ГПП і снежня і на партбюро ФПМ 4 снежня 1986 года,— паведамляе сакратар партбюро ФПМ Б. С. Каліцін.

Нягледзячы на інструктаж камісій, праведзены ў камітэце камсамола факультэта перад атэстацыяй студэнтаў, у некаторых групах усё ж была парушана працэдура правядзення справаздачна-выбарных камсамольскіх сходаў і грамадска-палітычнай атэстацыі. У групах І і 10 ІІІ курса так і засталася невядомай роля асабістых комплексных планаў у ГПП. У асобных студэнтаў у комплексных планах адсутнічалі адзнакі аб выкананні ўзятых абавязацельстваў, самі планы вядуцца нярэдка неахайна. У час атэстацыі у асобных групах студэнты былі пасіўныя пры абмеркаванні камсамольскай работы і іх асабістага ўдзелу.

Камітэт камсамола ФПМ узяў пад кантроль парадак вядзення асабістых комплексных планаў.

вышэйшая школа: шляхі перабудовы

# БУМЕРАНГ «філасофіі пераймання»

ЗНАЧНЫ ЎПЛЫЎ на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу можа аказваць сёння вузаўская навука. Канкрэтныя прыклады могуць прывесці ў кожнай ВНУ. Вось толькі два з іх. Эканамічны эфект ад выкарыстання ў мінулай пяцігодцы 800 новых распрацовак БДУ імя У. І. Леніна склаў больш чым 111 мільёнаў рублёў. Летась знайшлі прымяненне ў народнай гаспадарцы краіны 85 вынаходстваў вучоных Мінскага радыётэхнічнага інстытута.

Аднак калі падыходзіць да вузаўскай навукі з пункту гледжання эфектыўнасці выкарыстання яе магчымасцей — а менавіта так ставіцца сёння пытанне,— то трэба прызнаць, што навуковы патэнцыял вышэйшай школы горада працуе на патрэбы народнай гаспадаркі далёка не поўнасцю. І рэзерваў тут яшчэ вельмі многа. Узяць, напрыклад, навукова-тэхнічны ўзровень навінак. Не будзе перабольшаннем сказаць: размовы на гэту тэму нагналі аскому. З году ў год, бадай, на кожным сходзе вучоныя ВНУ абяцаюць узняць свае распрацоўкі на ўзровень лепшых сусветных аналагаў, а то і перавысіць іх. Але сыходзяць з трыбуны — і зноў за старое. І зноў праслаўтая «філасофія пераймання» вядзе іх па пракладзеных сцежках, на якіх замест стварэння прынцыпова новай тэхнікі крыху ўдасканальваецца старая. Ці не таму ўступаюць яшчэ замежным нашы аўтамабілі, трактары, ЭВМ? Летась гарком партыі папрасіў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэспублікі падлічыць удзельную вагу навінак, распрацаваных мінскімі ВНУ, якія па свайму ўзроўню перавышаюць сусветныя аналагі. Атрымалася, што з 40 толькі адна адпавядае гэтаму паказчыку. Зусім мала прадаюць за мяжу мінскія ВНУ ліцэнзій і патэнтаў. Адзін Фізіка-тэхнічны інстытут АН БССР прадае іх столькі, колькі ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы горада.

Дык чаму ж вучоныя мінскіх ВНУ дазваляюць сабе працаваць напаўсілы? Аказваецца, тлумачыцца ўсё вельмі проста. Па-першае, прамысловасці ўсё роўна, якую навінку прапаноўваюць ёй вучоныя — на ўзроўні сусветных аналагаў ці не. Для іх галоўнае, каб валтузні з ёй было менш пры ўкараненні. А кіраўнікі ВНУ, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэспублікі раўнадушна глядзяць на гэта. Зайдзіце, скажам, сёння ў патэнтна-інфармацыйную службу любога інстытута горада, спытайце карту тэхнічнага ўзроўню на закончаную распрацоўку прыбора, іншай тэхнікі — упэўнены, вам яе не пакажуць. Яе не будзе. А калі і знойдзецца выпадкова, то няпоўная. Як жа можна ацэньваць узровень ствараемай навінкі, калі... няма такой ацэнкі?! Адсюль недалёка і да пустой траты дзяржаўных сродкаў. Напрыклад, летась Белгалоўэнерга заплаціла Мінскаму педінстытуту імя А. М. Горкага 90 тысяч рублёў за рэкамендацыі, вельмі павярхоўныя і трывіяльныя. Наўрад ці стане заказчык чытаць іх.

Вось чаму сёння ў ВНУ павінна быць кардынальна перабудавана работа ўсіх патэнтна-ліцэнзійных службаў, сістэма навукова-тэхнічнай інфармацыі: гэта дазволіць нацэліць даследчыкаў на пошук прынцыпова новых рашэнняў. Дарэчы, і тут не першы год мы чуем ад кіраўнікоў ВНУ абяцанні змяніць свае адносіны да такіх службаў. Аднак па-ранейшаму патэнтна-ліцэнзійныя службы туляцца «на задворках» інстытутаў, запаўняюцца выпадковымі кадрамі. Пакуль толькі ў Беларускім політэхнічным інстытуце летась была створана адзіная ў рэспубліцы кафедра эканомікі арганізацыі навукова-даследчай работы, патэнтазнаўства і права, якая ўзяла на сябе ролю метадычнага кіраўніка патэнтна-ліцэнзійнага аддзела ВНУ. І неўзабаве палепшыліся вынікі яго работы. За апошнія два гады, напрыклад, інстытут наведалі 9 дэлегацый з ФРГ, Японіі, Югаславіі, Балгарыі, Аўстрыі, якім было прапанавана 12 ліцэнзійных тэм. За гэты час заключаны тры ліцэнзійныя пагадненні. Акрамя таго, трэба значна ўзняць метадычную ролю і адказнасць Мінскага філіяла Усесаюзнага цэнтра патэнтных паслуг.

Узровень распрацовак ВНУ залежыць і ад таго, над якімі тэмамі наогул працуюць вучоныя. Замінаюць пакуль драбнатэмнасць, вырашэнне прыватных задач. За прыкладамі хадзіць далёка не трэба. Узяць, скажам, Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі. Тут выконваюцца 83 гаспадарчыя дагаворы. Адной тэмай у сярэднім займаюцца 3 навуковыя работнікі. У выніку сярэдні аб'ём адной гаспадарча-дагаворнай работы не перавышаў за апошнія гады 13 тысяч рублёў. Аб якой жа сур'ёзнай выніковасці можна весці размову? Да таго ж інстытут практычна не мае доўгатэрміновых заказаў на правядзенне навукова-даследчых работ ад міністэрстваў і ведамстваў, якія звязаны з сельскагаспадарчай вытворчасцю. А адсутнасць мэтавага фінансавання па сельскагаспадарчай тэматыцы часта прыводзіць да выпадковых работ. Скажам, інстытут распрацоўваў вільгацямеры вугалю і будаўнічых матэрыялаў. Можна было б зразумець жаданне вучоных БІМСГа дапамагчы сумежным галінам, калі б такія ж праблемы не стаялі перад сельскай гаспадаркай: вымярэнне вільготнасці зерня, кармоў, глебы і г. д. Аднак за іх тут узяліся ў апошнюю чаргу.

І тут Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі не адзінокі. Вось ужо 15 гадоў супрацоўнічаюць паміж сабой спецыялісты «БелаўтаМАЗа» і вучоныя Беларускага політэхнічнага інстытута ў межах вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання. Рэгулярна заключаюцца гаспадарчыя дагаворы. Толькі ў мінулай пяцігодцы іх выканана 47 на суму звыш 2,6 мільёна рублёў. Эканамічны эфект ад укаранення распрацовак перавысіў 4,5 мільёна рублёў. Здавалася б, такія маштабы супрацоўніцтва, асабліва з улікам іншых выканаўцаў, павінны былі значна палепшыць якасць і надзейнасць выпускаемых аўтамабіляў, павысіць іх канкурэнтаздольнасць. Але гэтага не адбылося: навука тут ідзе па самым лёгкім шляху — робіць «дробныя ўколы», удасканальваючы асобныя вузлы і механізмы. Гэта і не дзіўна, бо ў межах вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання штогод выконваецца да 18 гаспадарчых дагавораў замест адной буйной комплекснай тэмы.

Пры такім распыленні сіл нельга разлічваць на высокую выніковасць даследаванняў, на дасягненне сур'ёзнага тэхніка-эканамічнага эфекту. Выхад — у фарміраванні комплексных дагавораў паміж ВНУ і прадпрыемствамі, ВНУ і міністэрствамі. Падкрэслім, менавіта комплексных. Бо толькі ў іх межах можна вырашаць буйныя праблемы. Дарэчы, летась заключыць такія дагаворы прапанаваў рэспубліканскім міністэрствам і ведамствам Беларускі політэхнічны інстытут. Гэта дало б магчымасць, з аднаго боку, аб'яднаць намаганні вучоных розных кафедраў, а з другога — шырока ўкараняць вынікі работ у галіне. Аднак лішнія клопаты не вельмі спадабаліся міністэрствам. Таму толькі адно з іх — Міністэрства будаўніцтва БССР — пасля доўгіх перагавораў згадзілася пайсці па гэтым шляху.

Другім напрамкам вырашэння праблемы з'яўляецца выкарыстанне праграмна-мэтавых метадаў арганізацыі навуковых даследаванняў. На жаль, у Мінску няма пакуль ніводнай буйной міжвузаўскай мэтавай комплекснай праграмы. А менавіта ад такіх праграм у многім залежыць распрацоўка найбольш прагрэсіўных відаў машын.

Яшчэ ў 1982 годзе ў тэхнічных ВНУ былі складзены планы навукова-тэхнічнай дапамогі прадпрыемствам Мінска. Кожны з вузаўскіх калектываў цвёрда паабяцаў тады — і пацвердзіў гэта ў дакументах — выканаць іх на сто працэнтаў, яшчэ вышэй узняць марку прадукцыі, якую выпускаюць аб'яднанні і заводы роднага горада. Аднак і на гэты раз, як аказалася, вучоныя не стрымалі слова. Час мінуў, а сур'ёзнага павароту ў гэтай справе не адбылося. Летась у Мінску была выкарыстана толькі кожная пятая вузаўская распрацоўка. Асабліва любяць укараняць свае навінкі «за трыдзевяць зямель» вучоныя БДУ імя У. І. Леніна. У Беларусі за мінулы год яны атрымалі наогул усяго 12 працэнтаў эканамічнага эфекту ад агульнай яго лічбы.

Як жа пашырыць уплыў вузаўскай навукі Мінска на прамысловасць горада? Напэўна, праз развіццё новых форм супрацоўніцтва вучоных і практыкаў. Па-першае, новы імпульс павінны атрымаць вучэбна-навукова-вытворчыя аб'яднанні. Іх сёння ўжо 26. Не так даўно гарком вывучыў і абагульніў вопыт іх работы. Выяўлены многія недахопы. Напрыклад, аб'яднанні, створаныя на базе Беларускага тэхналагічнага інстытута, Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі і Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, выкарыстоўваюцца ў асноўным для праходжання студэнтамі вытворчай практыкі.

Навуковыя ж даследаванні для вытворчасці носяць характар звычайных сувязей, часам нават кароткачасовых. У некаторых вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднаннях Беларускага тэхналагічнага інстытута за ўвесь час выкананы ўсяго па 2—3 гаспадарча-дагаворныя работы з гадавым аб'ёмам даследаванняў да 15—20 тысяч рублёў кожная.

Па-другое, неабходна шырэй ствараць лабараторыі двайнога падпарадкавання. Цікавы вопыт гэтай работы ёсць у Мінскім радыётэхнічным інстытуце. На грамадскіх асновах інстытут стварыў восем навукова-вытворчых лабараторый, якія актыўна дзейнічаюць на Мінскім гадзіннікавым заводзе, у вытворчых аб'яднаннях «Гарызонт», «Інтэграл», імя У. І. Леніна і іншых. Лабараторыі камплектуюцца навуковымі і інжынерна-тэхнічнымі кадрамі па тэматыцы вырашаемай праблемы.

Практыка работы парткома і рэктарата Мінскага радыётэхнічнага інстытута па развіццю эфектыўных форм сувязі вузаўскай навукі з вытворчасцю была разгледжана на семінары сакратароў парткомаў ВНУ. Ім прапанавана больш актыўна ствараць часовыя творчыя калектывы і лабараторыі двайнога падпарадкавання. Пытанні гэтыя гарком трымае на асобым кантролі. У прыватнасці, савет садзейнічання НТП хутка будзе разглядаць, як развівае такое супрацоўніцтва з прамысловасцю горада БДУ імя У. І. Леніна.

Трэці напрамак гэтай работы — выязныя пасяджэнні савета садзейнічання НТП на буйных прадпрыемствах, у інстытутах горада, што дазволіць на месцы аналізаваць магчымасці навукі і патрэбы практыкі. Дарэчы, тым самым будзе пастаўлена заслона і ўзаемным абвінавачванням, якімі «абменьваюцца» нярэдка навука і вытворчасць. Акрамя таго, зараз фарміруюцца два навуковыя падраздзяленні ў Беларускім НДІ навукова-тэхнічнай інфармацыі і НДІ эканамічных даследаванняў Дзяржплана БССР. Задача іх — удасканальваць сістэму кіравання навукова-тэхнічным прагрэсам. У прыватнасці, яны абавязаны будуць стварыць банк даных аб магчымасцях мінскай навукі і патрэбах прамысловасці. Такім чынам можна будзе не толькі пазбавіцца ад дубліравання навуковых тэм, але і наладзіць каардынацыю даследчай работы ў інстытутах горада.

І. КЛІМАЎ,
загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага ГК КПБ.
С. БУЛАЦКІ,
кар. «Звязды».



# Вашы дзіўныя моманты...

*жыві, імгненне!*

*НА ВУЛІЦЫ трашчыць дваццаціградусны мароз. А на здымках... дзіўныя моманты гарачага лета. Вядомыя майстры нашай фотажурналістыкі заўважылі і змаглі*



*данесці іх да чытачоў. Але ж такія імгненні вельмі часта бачыць і кожны з нас! У першым навагоднім нумары мы напамінаем, што рэдакцыяй аб'яўлены фотаконкурс «Жыві, імгненне!». Усім, каму пашчасціла адлюстраваць нейкі цікавы кавалачак нашага шматграннага жыцця, мы прапануем падзяліцца сваімі фотаўдачамі з чытачамі «Беларускага ўніверсітэта». Пераможцаў фотаконкурсу чакаюць ганаровыя граматы і грашовыя прэміі.*

*Поспехаў вам!*



# ПРАДАЕЦЦА... ЭКЗАМЕН

*закон і ты*

*кампетэнтны субяседнік*

*Сёння ў гасцях «Беларускага універсітэта», як гэта прынята гаварыць у апошні час, кампетэнтны субяседнік — старшы следчы Маскоўскай пракуратуры г. Мінска Сяргей Іванавіч ПОЛХ. С. І. Полх, нягледзячы на тое, што ўжо старшы следчы, працуе ў пракуратуры нядаўна: з 1984 года. Ён, дарэчы, былы выпускнік БДУ гістарычнага факультэта філасофскага аддзялення.*

**— Сяргей Іванавіч, дзве розныя крымінальныя справы, з матэрыяламі якіх вы далі мне магчымасць пазнаёміцца, аб'ядноўвае тое, што іх узнікненню садзейнічалі выяўленыя факты хабарніцтва, якія мелі месца ў вышэйшых навучальных установах г. Мінска. Што, на ваш погляд, спрыяла ўзнікненню гэтай негатыўнай з'явы, калі разглядаць на наяўных прыкладах?**

— Асуджаныя М. І. Вазнюк, выкладчыца БДІНГ і М. А. Пучко, дацэнт медінстытута адносіны да хабарніцтва мелі нераўназначныя. Першая прыцягвалася за падбухторванне да дачы хабару і як хабарніца, другі — за пасрэдніцтва ў перадачы хабару. Ролі ў іх розныя, але абое павялі сябе, мякка кажучы, не лічачыся з законам. Абое — выкладчыкі буйных ВНУ, якія карыстаюцца прэстыжнасцю, конкурс у іх нязменна высокі. Гэта з аднаго боку. З другога — былі абітурыенты, якія жадалі ці чые бацькі жадалі набыць дыплом, спаборнічаючы не ў ведах ва ўмовах роўнага конкурсу, а, літаральна кажучы, любой цаной. На жаль, аказваецца, што і ў выкладчыцкай прафесіі сустракаюцца людзі беспрынцыповыя, як М. А. Пучко, і маючыя прыхільнасць да нажывы, як М. І. Вазнюк. І, на жаль, абодва бакі знаходзяць адзін другога, вынаходзяць агульную мову і здзейснілі, як у даных выпадках, здзелку. Іменна беспрынцыповасць, прага атрымаць прадмет жадання (грошы, дыплом) любой цаной, любым кампрамісам ляжаць у характары гэтай з'явы. Іншае пытанне: адкуль бяруцца такія людзі, што садзейнічае атрафіраванню ў іх паняццяў гонару, сумлення, прыстойнасці?

**— Аднак, як вы лічыце, чаму два ўжо ўвогуле немаладыя чалавекі, якія пражылі, напэўна, нялёгкае жыццё, карысталіся павагай сярод сяброў, калег, як гэта сведчаць службовыя характарыстыкі, адважыліся, іншага слова не знайду, усім гэтым ахвяраваць, дакладней, рызыкнуць? Навошта? Ці толькі ў сілу сваёй беспрынцыповасці і прагі грошай?**

— Пытанне: аб чым думалі гэтыя людзі, наўмысна ідучы на парушэнне закона? Адказ на яго хутчэй далі б псіхолагі, сацыёлагі. Наогул, я, ведаеце, не веру, калі чытаю часам газетны артыкул, дзе журналіст анатаміруе душу злачынцы, аналізуе ледзьве не кожны крок да яго падзення, даследуе ўздоўж і ўпоперак супярэчлівую асобу і знаходзіць нарэшце адказ на пытанне: «навошта?». Імкненне журналіста зразумелае: бо не бывае так — жыў-быў добры чалавек і раптам яго д'ябал спакусіў. Таму журналіст і жадае пранікнуць у глыбіню, прадставіць падрабязны аналіз фактараў, якія сыгралі ракавую ролю ў лёсе антыгероя (я ўжо не кранаю выхаваўчы эфект такіх артыкулаў). Але мяне здзіўляе, адкуль, зыходзячы з якога матэрыялу, журналіст так скрупулёзна выпісвае думкі і тайныя намеры злачынцы. Бо далёка не кожны пішучы — Дастаеўскі ў той ступені, што здольны, як ён, выразна ўявіць сябе на месцы антыгероя. Па меншай меры тут неабходны вельмі блізкі кантакт. А на такое збліжэнне пойдзе далёка не кожны чалавек, не гаворачы ўжо пра злачынца. Добра, калі той сумленна расказаў усё, як на споведзі — які-ніякі матэрыял. Але не сакрэт, што нярэдка такое пакаянне мае на мэце зменшыць сабе меру пакарання. Ну, а калі злачынец да канца шчыры толькі ў той ступені, наколькі яму гэта выгадна? Як можна давяраць яго апісанню свайго душэўнага стану?

Аднак нярэдка злачынец паводзіць сябе па-іншаму. Вазнюк. Разумная жанчына, з аналітычным складам розуму, артыстычная, валявая, вытрыманая — усё адмаўляла, устройвала сцэны, ілгала, старалася заблытаць следства. Якімі матывамі кіравалася яна, якімі прынцыпамі, сумяшчаючы педагагічную, навуковую дзейнасць з махінацыямі? Не адкажу. Дарэчы, пра навуковую дзейнасць. У вечар, калі вырашалася пытанне аб узяцці яе пад варту, вы б паслухалі, як адмыслова, з якой сілай, з жаданнем пераканаць следчыя органы ў яе прыстойнасці яна малявала сябе ахвярай навукі. Усё, маўляў, у яе было толькі адной прыхільнасці аддадзена — навуцы. Асабістае жыццё, і тое засталося ўбаку, толькі праца на карысць навукі! І сапраўды: паверыць можна, перад ёю ў Вазнюк ёсць свае заслугі, пра што сведчыць цэлы спіс навуковых прац.

**— А можа у некаторых асобных людзей, упэўненых у сабе за кошт сваёй паспяховай дзейнасці, маючых імя, прызнанне, вагу ў грамадстве, сталыя сувязі, уплывовых сваякоў, ствараецца ілюзія беспакаранасці?**

— Можа быць і так. Да прыкладу, М. Вазнюк аднойчы выказала шчырае здзіўленне: за што? Няўжо лічыце злачынцай? За нейкія няшчасныя некалькі соцень? Вунь у мяне суседка па камеры, дык з чым раўняць: у яе — дваццаць адна тысяча, хоць ведаю, за што ўзялі. А за што мяне? Прынамсі злачынец можа разважаць і так: у кіно паказваюць, у газетах пішуць — і машыны меў, і дзве кватэры, і дачу з лазняй, і нават, прабачце, ва уборнай хрустальная люстра вісела, а колькі ў яго на кніжках было! І нічога: карыстаўся, жыў... пакуль. Але нешта занадта доўга не наступала для яго гэтае «пакуль», нягледзячы на тое, што ён і не хаваў сваёй раскошы. Дык гэта — ён. А я? Я перад ім — сумленны чалавечак, калі трошкі і пакладу ў кішэню, дык што з таго?

**— Сяргей Іванавіч, памятаеце справу дырэктара (былога) тэхнікума савецкага гандлю, якая прыцягвалася да адказнасці за хабарніцтва? Аб гэтым даволі многа пісалася на старонках друку. Аднак у адным ракурсе: маўляў, прымаючы ў тэхнікум дзяцей сваіх землякоў і падарункі за гэта, яна такім чынам адказвала дабром на дабро, зробленае ёй раней землякамі. І, маўляў, пры гэтым не ведала, што творыць. І не ведалі бацькі, падносячы ў знак вялікай радасці прэзенты, што гэта зусім не знак, але плата за яе. І ў адпаведнасці з такім жа добразычлівым тонам рабіўся вывад: мяжа паміж дабром і злом праходзіць у кожнага з нас. А вы як юрыдычная асоба альбо проста як чалавек што наконт гэтага мяркуеце? Ці эфектыўны такі журналісцкі падыход, накіраванасць якога — не «маляваць адмоўнага героя адной чорнай фарбай, інакш чытачу цяжка будзе ўявіць сябе на яго месцы і зрабіць вывады ў адносінах да сябе?»**

— Я асабіста вызначаю названую мяжу паміж дабром і злом мерай законнасці. Закон — гэта не збор правілаў, ён найперш за ўсё вартавы нашых з вамі інтарэсаў і ўжо тым самым адмяжоўвае зламыснікаў ад грамадства. Спроба размыць гэтую мяжу тоіць у сабе пагражае, мякка кажучы, ліберальнічаннем. Бо тая дырэктрыса, у якім бы яна ні знаходзілася няведанні, што такое «бескарыслівасць» і што такое выкарыстанне службовага становішча, свядома ўшчамляла некага ў правах. Нехта з абітурыентаў так і не стаў студэнтам з-за таго, што на гэтае месца ўжо меўся на ўвазе другі, «свой». Урэшце, тэхнікум — гэта дзяржаўная ўстанова, а не свая вотчына. Дырэктар даверанай установы забылася на гэта. Ну, а вынік, лічу, заканамерны. Апраўдваць яе дзеянні і паводзіны — супярэчыць логіцы.

Хачу таксама напомніць, што атрыманне хабару КК вызначае прыняцце службовай асобай асабіста ці праз пасрэднікаў якой-небудзь матэрыяльнай каштоўнасці (прадметаў, грошай) за выкананне ці невыкананне ў інтарэсах даўшага хабар дзеяння, якое гэта асоба павінна была ці магла здзейсніць у сілу свайго службовага становішча.

**— Ёсць руская прыказка: «Кто взял — на том один грех, кто дал — на том 100».**

— Вы пра хабарадавальнікаў? Хаця закон і ўстанаўлівае для іх меру адказнасці, але ў мэтах выкрыцця хабарнікаў, службовых асоб, прыняўшых хабар, савецкі закон устанавіў, у якіх выпадках ён вызваляецца ад крымінальнай адказнасці. Напрыклад, калі ён добраахвотна заявіў аб гэтым да таго, як стала вядома, што факт хабару расследуецца дзяржорганамі. Нярэдка факты хабарніцтва і становяцца вядомымі пасля такіх заяў хабарадавальнікаў, якія чыстасардэчна раскайваюцца. Чыстасардэчна? Магчыма, таму што шкада грошай. Хабарадавальнікамі ў такіх выпадках хутчэй рухае прага помсты, жаданне правучыць, боязь застацца ў дурнях. І вельмі рэдка сапраўднае ўсведамленне несамавітасці свайго ўчынку. Бо не было б іх, хабарадавальнікаў, не было б і хабар прымаючых. Аднак калі б чалавек не меркаваў, не разлічваў на тое, што ад яго прымуць, ён бы і не цягнуўся працягнуць руку з падарункам. Усё ж лічу, што болей небяспечныя — хабарнікі.

Напрыклад, у справе з Вазнюк фігуруе хабарадавальнік Т. Т., якая звярнулася да першай, каб тая ёй пасадзейнічала пры паступленні ў інстытут. У размове аб «ганарары» за будучыя стараннi Вазнюк намякнула, што за экзамен — «па адной». Аднак Т. П. не зрэагавала на іншы намёк: што людзі, якія дапамагаюць такім чынам паступіць, «купляюць потым машыны», і прынесла ёй «толькі» 400 рублёў. Вазнюк расцаніла гэтую суму як задатак і пры наступнай размове сказала без хітрыкаў, што Т. Т. да паступлення ўсяго толькі нічога — астатняй часткі ўзносу — ...5.600 рублёў. І з-за таго (!), што ў Т. Т. такіх грошай не было, яна перадумала паступаць у такі «каштоўны» інстытут. Пасля неаднаразовых спроб вярнуць першапачатковы «ганарар», Т. Т. урэшце звярнулася ў міліцыю. А магло ж быць усё інакш.

**— Сапраўды, ненадзейная трапіла кліентка, падвяла. Дарэчы, як знаходзяцца гэтыя кліенты? У дзвюх справах фігуруюць пасрэднікі, тыя, хто забяспечвае будучага патэнцыяльнага хабарніка будучымі патэнцыяльнымі хабарадавальнікамі з абвостраным пачуццем падзякі. Як закон ставіцца да садзейнічаючых асоб?**

— Хаця і гаворыцца, што на лаўца і звер бяжыць, але лаўцу, зразумела, не выгадна чакаць сваю здабычу без прыкрыцця. Звычайна садзейнічаюць сваім блізкім, добрым знаёмым, знаёмым знаёмых як з аднаго, так і з другога боку. Што датычыць пакарання за дапамогу ва ўсталяванні кантакту, то яна не менш строгая, чым да асоб, усталяваўшых кантакт. Пасрэдніцтва — гэта адзін з трох відаў злачынстваў, аб'яднаных у савецкім крымінальным праве паняццем «хабарніцтва». Пасрэдніцтвам прызнаецца здзяйсненне дзеянняў, накіраваных на перадачу хабару ад адной асобы другой, напрыклад, непасрэдная перадача прадмету хабару, стварэнне ўмоў для такой перадачы і г. д.

У справе № 93386 асуджаны Пучко з'яўляецца пасрэднікам. Ён па просьбе сваёй далёкай сваячкі В. А. Карп пасадзейнічаў паступленню ў інстытут дачцы Пянькоўскіх тым, што звязаўся з членам прыёмнай камісіі, асістэнтам кафедры фізікі МДМІ М. Л. Башун. Пучко намякнуў М. Л. Башун, што «бацькі дзяўчыны заможныя і пры станоўчым рашэнні пытання будуць удзячны». Пасля таго, як пытанне было «вырашана станоўча», удзячныя бацькі стрымалі сваё слова. Яны прывезлі сваёй знаёмай В. А. Карп грошы ў суме 1.400 рублёў. Карп перадала іх Пучко. Пучко, палічыўшы, што сума для Башун, адвёз грошы ёй. Башун царственна-моўчкі прыняла знак глыбокай павагі і бескарыслівай падзякі. Але. Па арт. 5, ч. 1, п. 4 КПК БССР (з прычыны акта амністыі) крымінальныя справы ў адносінах М. Л. Башун і В. А. Карп былі спынены. У выніку «пацярпеўшым» аказаўся Пучко. Горкая іронія гучыць у яго рытарычным пытанні: «Мне што, было больш за ўсіх патрэбна?»

У завяршэнне гутаркі хочацца сказаць некалькі слоў пра разбэшчваючую сілу хабарніцтва, якая складвае своеасаблівы стэрэатып мыслення: усё прадаецца, усё купляецца. У хабарадавальнікаў і хабарнікаў у аднолькавай ступені абуджаецца нахабнасць, апетыт гандляваць як матэрыяльнымі, так і нематэрыяльнымі каштоўнасцямі. А ў выніку нясуць страты грамадства, яго сумленныя працаўнікі... Але савецкі закон іх у крыўду не дасць.

Гутарку вяла
А. ВІХРОВА,
наш кар.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

8 студзеня 1987 года.
АТ 06012. Зак. 134.



220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.



Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.